## Список источников и литературы

1. Ключевский, В. О. Сочинения : в 9 т. / В. О. Ключевский – Москва : Мысль, 1987 – Т. I. Курс русской истории. Ч. 1. – 430 с.

2. Ключевский, В. О. Сочинения : в 9 т. / В. О. Ключевский – Москва : Мысль, 1988. – Т. II. Курс русской истории. Ч. 2. – 447 с.

3. Ключевский, В. О. Сочинения : в 9 т. / В. О. Ключевский – Москва : Мысль, 1988. – Т. III. Курс русской истории. Ч. 3. – 414 с.

4. Ключевский, В. О. Сочинения: в 9 т. / В. О. Ключевский – Москва : Мысль, 1989. – Т. V. Курс русской истории. Ч. 5. – 476 с.

5. Ключевский, В. О. Сочинения: в 9 т. / В. О. Ключевский – Москва : Мысль, 1990. – Т. IX. Материалы разных лет – 525 с.

УДК 271.2-9-774(476.2-37Гомель)«18/19»

**А. М. Чаропка**
ДУА «Пакалюбіцкая сярэдняя школа», г. Гомель
**С. А. Чаропка**
ГДУ імя Ф. Скарыны, г. Гомель

# ФАРМІРАВАННЕ ПРЫХАДСКОГА ЖЫЦЦЯ СВЯТА-МІКІЦКАГА ХРАМА Ў ПАКАЛЮБІЧАХ У XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

*Праваслаўная царква на працягу больш тысячагоддзя адыгрывае важную ролю ў жыцціі беларускага грамадства. У прадстаўленым артыкуле даследуецца фарміраванне прыхадскога жыцця ў вёсцы Пакалюбічы ў XIX ст. Аўтары выяўляюць імёны духавенства прыхода і прыходзяць да высновы аб тым, што XIX ст. стала найбольш спрыяльным часам для развіцця рэлігійнага жыцця ў вёсцы.*

Кіраўніцтва Расійскай імперыі, дзе Праваслаўная царква мела дзяржаўны статус, актыўна стымулявала будаўніцтва цэркваў на далучаных да Расіі беларускіх і ўкраінскіх землях. Першае ўзгадванне аб наяўнасці ў Пакалюбічах храма, а гэта значыць і заснаванні прыхода, адносіцца да 1801 г. Але, верагодна, гэта была не першая царква ў вёсцы. Драўляная царква паводле мясцовых старажылаў знаходзілася на месцы старажытнага гарадзішча на

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўскраіне сучаснага аграгарадка [1]. Першымі вядомымі святарамі, якія служылі ў царкве, былі іерэй М. Валатоўскі і дыякан П. Валатоўскі [2]. Калі была пабудавана гэтая царква невядома, але можна меркаваць, што ў перыяд з 1792 г. па 1800 г. Такое меркаванне звязана з тым, што на картах Магілёўскага намесніцтва 1780 і 1792 гг. Пакалюбічы адсутнічаюць сярод населеных пунктаў, якія маюць царкву [3; 4].

У 1811 г. была пабудавана новая каменная царква, якая была названа ў гонар вялебнага Мікіты Спавядальніка. Абапіраючыся на выпіскі з матэрыялаў крыніц, якія змяшчаюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, а таксама артыкулы ў газеце «Магілёўскія епархіяльныя ведамасці», нам удалося аднавіць карціну рэлігійнага жыцця ў вёсцы. Імёны першых святароў, якія служылі ў Пакалюбічах на момант адкрыцця Мікіценскага храма невядомыя, але ў 20-я гг. XIX ст. тут служыў айцец Іаан Жудро [2]. У 1824 г., як нам падаецца не без удзелу а. Іаана, у Пакалюбічах адкрылася царкоўна-прыходская школа на 10 вучняў. У 1826 г. пасаду настаяцеля ў Мікіценскай царкве заняў айцец Матфей Бекарэвіч, які служыў да сярэдзіны 30-х гг. [5]. Да гэтага часу Пакалюбічыператварыліся ў самую буйную вёску Багуслаўскай эканоміі. У 1832 г. тут пражывала ўжо 299 рэвізскіх душ, а ў царкоўна-прыходскай школе навучалася каля 35 дзяцей мясцовых сялян [6, с. 81].

У другой палове 1830-х гг. у царкве служылі святар Грыгорый Кернажыцкі і дыякан Васіль Бруевіч [7]. У 40-х гг. XIX ст. У Пакалюбічах назіраецца частая змена кліра. У 1839 г. У Мікіценскую царкву быў накіраваны выпускнік духоўнай семінарыі Пётр Казлоўскі, але праслужыў ён у Пакалюбічах нядоўга, таму што ў 1840 г. У Пакалюбічы настаяцелем быў прызначаны а. Я. Бекарэвіч [7]. У сярэдзіне 1840-х гг. у Мікіценскай царкве служыў Сімеон (або Самсон) Жудро, які ў 1846 г. быў пераведзены ў Нямкі, а на яго месца быў накіраваны А. Сакалоў, які на месца прызначэнне не з'явіўся [7].

Сапраўднай эпохай у жыцці Пакалюбіцкай Мікіценскай царквы з'яўляецца служэнне а. Кліменція Пятровіча Пяскоўскага, які стаў заснавальнікам цэлай дынастыі пакалюбіцкіх святароў. Малады выпускнік семінарыі быў прызначаны настаяцелем Мікіценскага храма ў 1847 г. і служыў у царкве больш паўвека – да сваёй смерці ў 1894 г. [2]. Кліменцій Пяскоўскі шмат зрабіў для паляпшэння духоўнага і адукацыйнага ўзроўню пакалюбцаў і жыхароў навакольных вёсак, якія адносіліся да прыхода. Палепшылася



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

матэрыяльная база царквы. У 1863 г. да царквы была прыбудавана званіца. Царква стала цэнтрам не толькі рэлігійнага жыцця, яна адыгрывала вялікую ролю ў адукацыі мясцовага насельніцтва. Пры царкве дзейнічалі дзве прыходскія школы – у саміх Пакалюбічах і вёсцы Лапаціна.

За сваю дзейнасць а. Кліменцій неаднаразова атрымліваў узнагароды з рук царкоўнага кіраўніцтва. У 1885 г. «награждены по Могилевской епархии: камилавкою – Гомельского уезда, церкви села Поколюбичи, священник Климент Пясковский» [8, с. 71–72]. У 1888 г. ён атрымаў архіпастырскае блаславенне «за труды по устройству прихода и наставлению прихожан истинам веры и благочестия; того же числа – крестьянам д. Лопатина, Поколюбичского прихода Гомельского уезда, за их усердие к церковно-приходской школе» [9].

Апрача самога настаяцеля ў абодвух школах з 1871 г. выкладаў Ігнат Іванавіч Зубаў. За навучанне ў Лапацінскай школе 24 хлопчыкаў і 1 дзяўчынкі ў 1888 г. ён атрымліваў *«от общества 50 рублей за учебное время; учащихся 24 мальчика и 1 девочка»* [10]. У 1881 г. ён, працягваючы навучаць дзяцей, стаў псаломшчыкам у Пакалюбіцкай Мікіценскай царкве. Пазней Ігнацій Зубаў атрымаў сан дыякана, а ў 1914 г. стаў свяшчэннікам і быў пераведзены ў царкву Раства Хрыстова ў вёсцы Калюдаўка Рагачоўскага павета. Апрача а. Кліменція Пяскоўскага і Ігната Зубава ў Мікіценскай царкве служыў дыякан Фёдар Садоўскі, які памёр у 1884 г. [11].

Пасля смерці Кліменція Пяскоўскага ў 1894 г. настаяцелем Мікіценскай царквы стаў яго сын а. Філіп Кліменцьевіч Пяскоўскі. Да свайго прызначэння Філіп Пяскоўскі скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю і працаваў настаўнікам спеваў у Гомельскім духоўным вучылішчы. У 1890 г. ён прызначаны святаром у Язерскую царкву Чэрыкаўска павета [12; 13]. У 1894 г. «священник Езерской церкви, Чериковского уезда, Филипп Пясковский, резолюцией Его Преосвященства от 2 сентября, согласно прошению, перемещен к Покалюбичской церкви» [14]. Філіп Квяткоўскі быў актыўным удзельнікам Гомельскага аддзялення Магілёўскага Багаяўленскага брацтва, што было ўтворана ў 1897 г. На патрэбы гэтай арганізацыі а. Філіп накіроўваў сродкі, якія здабываліся на духоўных канцэртах, дзе браў удзел хор Пакалюбіцкай Мікіценскай царквы. Падчас яго службы ў Пакалюбічах пачаўся працэс стварэння яшчэ не даследаванага намі летапісу Пакалюбіцкай Мікіценскай царквы за 1887–1914 гг.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Дзякуючы падарожным заметкам епіскапа Магілёўскага і Мсціслаўскага Місаіла можна ўявіць сабе як выглядала Пакалюбіцкая Мікіценская царква ў 1897 г. «Храм, построенный в 1811 году старанием и на средства прихожан, каменный (в виде корабля), с такой же колокольнею, в прошлом (г. зн. 1896) году ремонтирован усердием тех же прихожан, благовидный» [15].

У 1886 г. Пакалюбічы сталі цэнтрам воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У склад воласці ўваходзілі вёскі Лучынцы, Данілавічы, Яроміна, Заліп'е, Касцюкоўка, Краснае, Лапацін, Старое Сяло, размяшчаліся пяць праваслаўных прыходаў. У гэты час у саміх Пакалюбічах пражывалі 848 жыхароў на 138 падворках [6, с. 89]. Напрыканцы XIX ст. колькасць насельніцтва Пакалюбічаў значна павялічылася. У 1898 г. у прыход праваслаўнай Мікіценскай царквы ўваходзіла 2695 прыхаджан сяла і наваколля

У 1903 г. новым настаяцелем стаў а. Аляксей Пяскоўскі, які пасля заканчэння Магілёўскай духоўнай семінарыі з 1890 г. працаваў настаўнікам у царкоўна-прыходскай школе мястэчка Хальч, дзе служыў яго бацька Леў Пяскоўскі (брат Кліменція Пяскоўскага), а пасля прызначэння свайго дваюраднага брата Філіпа Пяскоўскага ў Пакалюбічы стаў настаяцелем у Язерскай царкве Чэрыкаўскага павета [16]. У 1910 г. Аляксей Пяскоўскі быў пераведзены з Пакалюбічаў у вёску Старое Сяло. Пазней, ужо ў 1926–1927 гг., ён з'яўляўся Гомельскім благачынным, менавіта так звяртаўся да яго са ссылкі епіскап Гомельскі Ціхан (Шарапаў).

Пасля пераводу А. Пяскоўскага ў Старое Сяло настаяцелем Пакалюбіцкай Мікіценскай царквы стаў Платон Мікалаевіч Гашкевіч, які з'яўляўся пляменнікам будучага святога Іаана Кармянскага (І. І. Гашкевіча). Да прызначэння ў Пакалюбічы а. Платон ужо прайшоў сур'ёзны шлях станаўлення як асоба і святара. Як і многія пакалюбіцкія свяшчэннікі ён скончыў курсы Магілёўскай духоўнай семінарыі, з 1891 па 1894 г. быў настаўнікам у Хальчанскай царкоўна-прыходскай школе, з 1894 г. быў святаром у Язерскай царкве Чэрыкаўскага павета, а затым у Івацкай царкве Гомельскага павета. За актыўную працу ў справе народнай асветы і выкананне пастырскіх абавязкаў а. Платон неаднаразова ўзнагароджваўся царкоўным кіраўніцтвам. Вядома, што разам са сваёй пастырскай дзейнасцю а. Платон працаваў настаўнікам закону Божага ў Пакалюбіцкім 2-класным земскім вучылішчы, Пакалюбіцкай жаночай і Лапацінскай царкоўна-прыходскай школах. З 15 мая 1915 г. а. Платону дапамагаў 19-гадовы ўраджэнец

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пакалюбіч Міхаіл Якаўлевіч Адамовіч, які скончыў Пакалюбіцкае 2-класнае земскае вучылішча і да свайго прызначэння праходзіў паслушанне ў Магілёўскім брацкім манастыры.

Такім чынам, у XIX ст. склаліся найбольш спрыяльныя ўмовы для рэлігійнага жыцця ў Пакалюбічах. Менавіта ў гэты час была пабудавана Мікіценская царква, у вёсцы сталі несці службу прадстаўнікі праваслаўнага духавенства. Наяўнасць царквы прадвызначыла з'яўленне ў Пакалюбічах першых устаноў адукацыі, дзе мясцовыя святары выкладалі не толькі Закон Божы, але і іншыя прадметы. У сваю чаргу некаторыя настаўнікі ў наступным станавіліся часткаю пакалюбіцкага кліра.

## Спіс крыніц і літаратуры


1. Храм преподобного Никиты исповедника, аг. Поколюбичи [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://pokolybichi.cerkov.ru. – Дата доступа: 10.12.2017.

2. Летапіс Пакалюбіцкай царквы // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2685. Воп. 1. Спр 1.

3. Карта Магілёўскага намесніцтва 1780 г. [Электронны рэсурс]. Рэжым доступа: https://www.radzima.net/maps/guberniya-mogilevskaya/mogilevskoe-namestnichestvo-karta-1780.jpg – Дата доступа: 12.10.2017.

4. Карта Магілёўскага намесніцтва 1792 г. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://www.radzima.net/maps/guberniya-mogilevskaya/mogilevskoe-namestnichestvo-karta-1792.jpg – Дата доступа: 12.10.2017.

5. Справа аб прыцягненні памешчыкам П. Гамзякавым сялян да працы ў нядзелю і святочныя дні // НГАБ. – Ф. 3021. Воп. 4. Спр. 1.

6. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Гомельскага раёна : у 2 кн. – Мінск: БЕЛТА, 1998. – Кн. 1. – 376 с.

7. Справа Беліцкай духоўнай управы // НГАБ. – Ф. 3021. Воп. 4. Спр. 2.

8. Могилевские Епархиальные Ведомости (МЕВ). – 1885. № 10. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://dlib.rsl.ru/60000152332 – Дата доступа: 12.10.2017.

9. МЕВ. – 1888. – № 9–10. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://dlib.rsl.ru/60000152789. – Дата доступа: 12.10.2017.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

10. МЕВ. –1888 – №1. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://dlib.rsl.ru/viewer/60000152769#?page=14. – Дата доступа: 12.10.2017.
11. МЕВ. 1884. – №5. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://dlib.rsl.ru/viewer/60000149396#?page=1. – Дата доступа: 12.10.2017.
12. МЕВ. 1890. – № 19. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://dlib.rsl.ru/viewer/60000154317#?page=6. – Дата доступа: 12.10.2017.
13. МЕВ. 1890. – № 26. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://dlib.rsl.ru/viewer/60000154237#?page=5. – Дата доступа: 12.10.2017.
14. МЕВ. – 1890. – № 26. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://dlib.rsl.ru/viewer/60000156975#?page=1. – Дата доступа: 12.10.2017.
15. МЕВ. – 1898– № 10–11. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://dlib.rsl.ru/viewer/60000149435. – Дата доступа: 12.10.2017.
16. МЕВ. – 1890. – № 29–30. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://dlib.rsl.ru/60000152386. – Дата доступа: 12.10.2017.

УДК 94(476) “1921/1939” + 271.22 (438) – 9

**А. Г. Цымбал**
МДЛУ, г. Мінск

# ПРАВАСЛАЎНАЯ ВЫДАВЕЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 ГАДЫ): СУЧАСНАЯ ПОЛЬСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ[1]

*Атрыкул прысвечаны даследаванню развіцця праваслаўнай выдавецкай дзейнасці ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд і гістарыяграфіі дадзенай праблемы. Разгледжаны прававыя ўмовы функцыянавання праваслаўных выданняў, іх характар і колькасць. Асаблівая ўвага нададзена беларускай праваслаўнай выдавецкай дзейнасці. Раскрыты мэты выданняў, а таксама праблематыка, якая ўздымалася ў публікацыях.*

[1] Даследаванне выканана пры падтрымцы БРФФД у рамках навуковага праекта Г20Р-011 «Сучаснае замежнае гістарычнае беларусазнаўства: эвалюцыя метадалагічных падыходаў і ацэнак».

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ